© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 24 (62)
16 верасьня 1996 г.
панядзелак

выходзіць у панядзелкі

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

Генадзь Карпенка:

«Падтрымкі рэжым не атрымае ніадкуль»

Карэспандэнт «Нашай Нівы» Алег Дашкевіч узяў інтэрвію ў намесьніка старшыні ВС Генадзя Карпенкі.

«НН»: Сп. Карпенка, сёньня, калі сытуацыя ў краіне напружваецца, калі невядомыя дасылаюць правакацыйныя лісты на адрас сьпікера парлямэнту, а бабулі знаходзяць пад сьценамі ВС пасланьні «чорных катоў», ці ня лічыце вы, што дэпутаты могуць неўзабаве апынуцца перад зачыненымі дзьвярыма Вярхоўнага Савету, у якім сапёры будуць шукаць чарговую бомбу?

Г.К.: Не, я думаю такога варыянту ня будзе. Будзе іншы: спроба знайсьці сярод дэпутатаў большасьць, каб гэтай большасьцю гэты парлямэнт і прыхлопнуць.

«НН»: А такі варыянт магчымы?

Г.К.: Думаю, наўрад ці. Хоць сёньня для гэтага адміністрацыя прэзыдэнта робіць шмат, асабліва ў рэгіёнах, з дапамогай вэртыкалі.

«НН»: Ці не зьмяніліся, на Вашу думку, адносіны да Лукашэнкі тых, хто падтрымлівае яго ў Маскве?

Г.К.: З такой палітыкай ён паразуменьня ў Расеі ня знойдзе. Гэта я дакладна адчуў пад час уласнага візыту. Лукашэнку патрэбная была інтэграцыя для таго, каб высунуць сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах у Расеі. Уся яго інтэграцыя зводзілася да інтэграцыі зь Зюганавым. Гэта не ўдалося. Цяпер робіцца другая спроба — праз сілавыя структуры.

Працяг на стар. 2

Што здарылася?

Славамір Адамовіч у Варшаве

Польская прэса рэгулярна знаёміць грамадзкасьць зь лёсам інтэрнаванага беларускага паэта Славаміра Адамовіча. Ужо ў чэрвені ў варшаўскай газэце «Głos» (№62), быў зьмешчаны пераклад верша «Убей президента». А ў сьвежым верасьнёўскім нумары «Głosu» (№101) зьявіліся пераклады ўжо цэлай нізкі вершаў Адамовіча, ўрывак зь ліста ў рэдакцыю «НН», а таксама паведамленьне пра гісторыю яго зьняволеньня і сухую галадоўку. Пераклады належаць вядомаму знаўцу беларускае літаратуры, літаратару і публіцысту Чэславу Сэнюху. Дзякуючы гэтаму перакладчыку па-польску ўжо гучалі Янка Купала і Якуб Колас.

Сёньня Адамовіч па-ранейшаму знаходзіцца ў віцебскай вязьніцы ў чаканьні суда. На думку ягонага адваката, сп. Паганяйлы, суд не адбудзецца раней рэфэрэндуму. Улады не зацікаўленыя ў стварэньні ажыятажу вакол «паэтычнага» працэсу напярэдадні восеньскіх палітычных боек.

Сяргей Харэўскі

Прадалі цеплаходы

Цеплаходы з імёнамі беларускіх гарадоў – Наваполацка і Навагрудка – больш ня зьявяцца ў портах сьвету пад расейскім сьцягам. Балтыйскае марское параходзтва ў Санкт-Пецярбургу (БМП) страціла гэтыя судны. Як паведамілі нам у інфармацыйнай службе БМП, цеплаходы былі арыштаваныя, прададзеныя за даўгі параходзтва і цяпер будуць эксплюатавацца новымі гаспадарамі пад новымі імёнамі. «Наваполацак» арыштаваны і прададзены ў Новым Арлеане. «Навагрудак» — у Антвэрпэне, двойчы. Першы раз яго купіла турэцкая фірма за 23 млн. бэльгійскіх франкаў. Аднак паводле ўмоваў аўкцыёну, калі на працягу двух тыдняў нехта прапануе большую цану, папярэдняя зьдзелка касуецца. Большую цану – 24 млн. дала кіпрская суднаходная кампанія. Як лічыць апошні капітан «Навагрудка» 55-гадовы Анатоль Бондар, цеплаход каштуе значна даражэй.

Абодва цеплаходы аднаго тыпу (дэдвэйтам 13.600 тон) і пабудаваныя ў Фінляндыі – «Наваполацак» у 1969-м, а «Навагрудак» у 1970 годзе. Беларускі бок ня выставіў пецярбурскаму параходзтву ніякіх прэтэнзіяў на кампэнсацыю за камэрцыйнае выкарыстаньне іменаў славутых беларускіх гарадоў.

Алесь Шкнай, Санкт-Пецярбург

Сярэднеэўрапейская сустрэча

З 6 да 9 верасьня ў Варшаве адбыўся II Міжнароды соймік моладзі Сярэдняй і Усходняй Эўропы. У Варшаўскім унівэрсытэце сабраліся дэлегаты з большасьці краінаў рэгіёну – ад Латвіі да Баўгарыі. Ад Беларусі прысутнічала група з 15 чалавек. Пэўныя непаразуменьні ўзьніклі з-за таго, што арганізатары Сойміка паспрабавалі выкарыстаць у якасьці беларускага сьцяга лукашэнкаўскі. У выніку ўдакладненьняў у залі быў вывешаны беларускі нацыянальны сьцяг.

Ідэя спатканьня належыць тым польскім колам, якія альбо зьвязаныя з тэрыторыямі нашага рэгіёну ад Вільні да Львова настальгічна, альбо бачаць Польшчу сапраўдным лідарам Сярэдняе Эўропы й таму падтрымліваюць усякую цікавасьць да польскае культуры й мовы. Але кожная дэлегацыя прыўнесла сваё спэцыфічнае бачаньне сытуацыі Сярэдняе Эўропы. Беларуская дэлегацыя выглядала ці не найбольш інтэлектуальнай.

Наступная такая сустрэча адбудзецца ў 1998 г. ужо ў Львове.

A.Dz.

Гісторыя

Трагедыя 1939-га

17 верасьня Заходнюю Беларусь, якая дваццаць гадоў як была ўключаная ў склад Польшчы, далучылі да Савецкай Беларусі. Падзея, якая ў афіцыйнай савецкай гісторыяграфіі называлася ўзьяднаньнем, з пазыцыяў незалежнай беларускай навукі дагэтуль не прааналізаваная і не ацэненая. Чаму? Напэўна, таму, што, па-першае, не назапашаны дастатковы фактычны матэрыял, па-другое, не разгледжаныя як сьлед усе «падаплёкі» той падзеі (напрыклад, пакт Молатава-Рыбэнтропа), па-трэцяе, не сфармуляваная тая сьветапоглядная база, на якой бы ў прынцыпе мог адбывацца незалежны беларускі аналіз.

Падрабязна пра падзею – на старонцы 13.

навіны 1-м сказам

навіны 1-м сказам

СУД. Менскі гарадзкі суд прысудзіў да розных тэрмінаў зьняволеньня сямёх грамадзянаў украіны, якія бралі ўдзел у забароненым жалобным шэсьці 26 красавіка сёлета.

Падрабязна пра суд – на старонцы 2.

ЛЕБЕДЗЬ. Аляксандар Лебедзь наведаў Менск, дзе абмеркаваў вывад у Расею пэрсаналу дзьвюх ліквідаваных расейскіх ракетных частак; пра зьмест гутаркі А.Лебедзя з А.Лукашэнкам нічога невядома.

ВІЗЫ. Чэскія ўлады плянуюць увесьці візы на ўезд для грамадзянаў Расеі; гэты крок выкліканы засьцярогамі супраць расейскіх крымінальных груповак; калі так здарыцца, то аўтаматычна візы будуць уведзеныя і для грамадзянаў Беларусі.

ВАЙНА. На ўрадавай нарадзе ў Маскве вырашана, што урэгуляваньне становішча ў Чачэніі магчымае толькі пры выкананьні расейскай канстытуцыі ды захаваньні тэрытрыяльнай цэласнасьці Расеі.

ПОЛЬШЧА. Прэзыдэнт Францыі Жак Шырак падчас свайго выступленьня ў польскім Сойме заявіў, што прыкладзе ўсе намаганьні, каб дапамагчы Польшчы як мага хутчэй уступіць у Эўрапейскі Зьвяз, а таксама ў NATO.

ЗОЛАТА. Міжнародны Валютны Фонд вырашыў прадаць частку сайго залатога запасу для скасаваньня даўгоў некаторых краінаў, але не Расеі і Беларусі.

ГАНДЛЁВАЯ ВАЙНА. Расея ўвяла 20-працэнтныя мытныя пошліны на тавары, што ўвозяцца з Украіны, дзе такая пошліна на расейскія тавары дзейнічае ўжо 2 гады.

КАМБОДЖА. Енг Сары – былы намесьнік кіраўніка Чырвоных Кхмераў Пол Пота, нягледзячы на ўчыненыя зь яго ўдзелам забойствы 3 мілёнаў чалавек, атрымаў поўную амністыю для, як было заяўлена ўрадам, поўнага замірэньня ў Камбоджы.

БАРЫС І НАІНА. Для папярэдняга абсьледаваньня перад апэрацыяй на сэрцы прэзыдэнт Расеі Ельцын зьмешчаны ў Цэнтральную клінічную лякарню Масквы, дзе пасьля апэрацыі на нырках ужо знаходзіцца ягоная жонка Наіна.

ІТАЛІЯ. Італьянская Ліга Поўначы правяла масавую дэманстрацыю ў падтрымку ідэі аддзяленьня гэтай найбольш прамыслова разьвітай часткі Італіі ды пераўтварэньня яе ў асобную краіну.

Падрабязна пра гэта – на старонцы 4.

НАФТА. Прэзыдэнт ЗША паслаў дадатковыя войскі на мяжу з Іракам, назваўшы гэты рэгіён «зонай жыцьцёва важных інтарэсаў ЗША».

ЯНОВІЧ. Сябру «Нашае Нівы», беларускаму пісьменьніку Сакрату Яновічу, які жыве на Беласточчыне, 4 верасьня споўнілася 60 гадоў. Віншуем.

Сьветлагорыя – мадэль грамадзтва

Звычайная сытуацыя – студэнту прапануюць падзарабіць, і ён едзе працаваць у дзіцячы аздараўленчы лягер.

Вялікія намеры...

Гэта мусіў быць шырокі праект. Лягер ствараўся для дзяцей з забруджаных зонаў. Ня толькі з Чарнобыльскай – тэхнагеннае забруджаньне Менску, забруджаньне ў выніку перапрацоўкі вайсковай хімічнай зброі на палігоне каля Саратава (Расея)... Адпачынак 450 дзяцей з забруджаных зонаў у санаторыі Сьветлагорскага ВА «Хімвалакно» з 15 ліпеня да 8 жніўня.

Мэдычная праграма праекту не абмяжоўвалася толькі вывучэньнем наступстваў забруджаньня ў дзяцей. Прапаноўваліся нетрадыцыйныя сродкі лекаваньня – ад дыеты (прарошчаная пшаніца зь мёдам, стравы з канюшыны і лебяды) да лячэньня пахамі і колерамі.

Акрамя мэдычнай былі яшчэ экалягічна-адукацыйная праграма (праз гульні даць дзецям уяўленьне пра экалёгію) і праграма сацыяльнай рэабілітацыі.

Апошняя – рэч асаблівая. Дзецям стварылі адмысловую краіну Сьветлагорыю як мадэль грамадзтва, распрацавалі легенду ўзьнікненьня гэтай краіны, плянавалася зрабіць свае сродкі масавай інфармацыі і Дзіцячы Парлямэнт.

Як журналіст, я стаў кіраўніком прэсавага цэнтру краіны Сьветлагорыі і адначасова галоўным рэдактарам усіх сьветлагарыйскіх газэт. У нашыя абавязкі ўваходзіла папулярызацыя нетрадыцыйных мэтадаў лекаваньня і прыахвочваньне дзяцей да актыўнай сацыяльнай дзейнасьці – удзелу ў гуртках і працы журналістаў.

Працяг на стар. 3

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Салідарнасьць

Ігар Бабкоў

Апошнім часам мне хочацца знайсьці, адкрыць для сябе новыя значэньні старых банальных словаў. Панятак «салідарнасьць» — адно зь іх. Як і шмат якія паняткі, што прыйшлі да нас з Захаду (дэмакратыя, плюралізм, талерантнасьць і г.д.), гэтае слова празрыстае толькі напалову: мы вывучылі правільнае значэньне і на гэтым спыніліся. Салідарнасьць не вырастала ў нашай крыві, яна ня сталася нашай эмоцыяй, яна не перарасла ў грамадзкі рэфлекс.

Беларускае грамадзтва ня ведае, што гэта такое — салідарнасьць. Грамадзтва падзеленае ўздоўж і ўпоперак, на гарады і вёскі, на рады і кланы, на рэгіёны і сацыяльныя групы, паводле моўных і культурных прыкметаў, паводле палітычных прыхільнасьцяў, паводле геаграфічных арыентацыяў і тусовак, і халера ведае яшчэ паводле чаго. Яно нават ня верыць, што сапраўды існуе як нейкая еднасьць, ня верыць, што яно сапраўды ёсьць.

І таму, калі паэта садзяць за верш, тэмпэратура крыві не мяняецца. Паэта, праўда, пачыняюць абараняць, прафэсійна, крыху стомлена і з каліўцам зьдзіўленьня: гэта ж нада так заляцець! Абараняюць, зноў жа, «блізкія» — людзі, якія, сутыкаючыся зь ім, здольныя ўявіць, што акрамя рэвалюцыйна-фантасмагарычных праектаў (цалкам уяўных) і фантасмагарычна-рэвалюцыйных вершаў (дастаткова таленавітых) ёсьць яшчэ жывы чалавек, якому ўсё ж ня варта месяцамі ляжаць на нарах. Для астатніх жа гэтая гісторыя — чыстая абстракцыя. Я тут не кажу пра ідэалягічных вэтэранаў з садысцкімі інстынктамі. Я маю на ўвазе звычайных, тых, хто, не пагаджаючыся з паглядамі, здольны зразумець і прызнаць: за верш саджаць нельга. Чаму анічога не зварухнулася ў іхняй крыві? Чаму няма страсьці?!

Мне сорамна, што менскія паэты (і я ў тым ліку) не стаялі на другі дзень перад сьценамі КГБ, дэклямуючы вершы, выяўляючы сваю салідарнасьць. Напэўна таму, што не было што выяўляць. Было спачуваньне, былі прагматычныя захады каб дапамагчы, але не было інстынктыўнага, першаснага, ірацыянальнага зруху. Не было ўласна салідарнасьці. Проста не знайшлося такога пачуцьця, недзе ўсярэдзіне, у глыбіні.

Магчыма, салідарнасьць — гэта занадта арыстакратычнае пачуцьцё: у ім прасьвечвае ўнутраная сіла і бескампраміснасьць. А Беларусь усё яшчэ паўплебейская краіна. Салідарным можа быць талент з талентам, годнасьць з годнасьцю. Немагчыма быць салідарным з рабом, з шэрасьцю, зь бясконцымі паўпраўдамі. А нашыя настаўнікі (нават самыя лепшыя) вырасьлі і зрасьліся з кампрамісамі. І цяпер, калі мы пытаемся ў іх, чаму яны маўчаць, мы чуем у адказ старую песьню: трэба захаваць тое, што ёсьць, ня трэба правакаваць, лепш перачакаць і г.д. За выключэньнем трох-чатырох чалавек, якія маюць сьмеласьць гаварыць, усе нашыя прафэсары й акадэмікі незалежна ад таго, у Вязынцы ці ў Вене яны рэалізуюць свае прафэсійныя амбіцыі, — усе яны маўчаць.

Магчыма таму беларуская сытуацыя такая шэрая, такая безнадзейная, такая ўбогая. Магчыма таму галоўнаму правакатару ўдаецца ўсё, што ён задумаў. Прыгадайма Менскую вясну, усе гэтыя паўкарнавальныя шэсьці, мітынгі, сутыкненьні. Усё гэта ня мела анікага прагматычнага сэнсу — і як адразу патыхнула свабодай, як зьмяніўся настрой, як пачалі падымацца з каленаў! Моладзь пайшла, — запелі ўсе камэнтатары й аналітыкі і пачалі плянаваць далей: хто ўзначаліць, хто павядзе, хто накіруе.

А гэта была ня моладзь, гэта была салідарнасьць.

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА
заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
вёрстка Іна Жызьнеўская
набор Тацяна Чуйвід
стыль Антон Кузьміч
карэктура Сяргей Сматрычэнка пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ 220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

Генадзь Карпенка:

«Падтрымкі рэжым не атрымае ніадкуль»

Працяг са старонкі 1.

Але сеньня ніхто яго сур'ёзна не ўспрымае, таму што бачаць, што ўсё робіцца наадварот. Калі ён кажа пра інтэграцыю і збліжэньне эканомік дзвюх краінаў, то як разумець тое, што ў Расеі праходзяць дэмакратычныя выбары, як прэзыдэнта, так губэрнатараў і мэраў, рэфармаваньне эканомікі, а ў Беларусі ўсё – у супрацьлеглым напрамку. Пра што сьведчыць стан нашай эканомікі і канстытуцыя Лукашэнкі, дзе дэмакратычных працэдураў упарадкаваньня ўлады проста не відаць. Выкручваюцца рукі як нашым бізнэсоўцам, так і замежным кампаніям, у тым ліку і расейскім, якія да нас прыходзяць працаваць. Усе грошы, якія яны ўкладаюць, вылятаюць «у трубу».

«НН»: Пад час вашага візыту ў Маскву, калі не сакрэт, з кім вы там сустракаліся?

Г.К.: Я пакуль ня буду называць іх прозьвішчы. Па іх просьбе. Адно магу сказаць, што расейскія сродкі масавай інфармацыі будуць аб'ектыўна асьвятляць падзеі ў Беларусі.

«НН»: Як вы лічыце, якім чынам будуць разьвівацца адносіны выканаўчай і заканадаўчай улады?

Г.К.: Спачатку будзе спроба раскалоць Вярхоўны Савет. Калі такога ня здарыцца і будзе пастаўлена пытаньне аб імпічмэнце, я думаю, магчымыя сілавыя мэтады. Ад гэтага чалавека можна чакаць усяго, чаго заўгодна. Розум у яго на другім месцы, таму любыя крокі магчымыя, але раней ці пазьней гэта ўсё скончыцца. Ён спрабуе ўсіх запалохаць, таму што сам баіцца найболей.

«НН»: Як будзе рэагаваць парлямэнт на ўжываньне сілы з боку выканаўчай улады?

Г.К.: Мы будзем зьвяртацца ў парлямэнты ўсіх краінаў, у Эўрапарлямэнт. У нас ужо такія звароты падрыхтаваныя, гатовы зварот у Дзярждуму Расеі. Я глыбока ўпэўнены, што падтрымкі рэжым Лукашэнкі не атрымае ніадкуль.

Украінскі працэс

З вокнаў на ўсіх паверхах суда, што выходзяць на двор, вызіраюць людзі. Чалавек трыццаць стаяць ля брамкі. Плюс ачапленьне міліцыі. Плюс пара аўчарак і «шлёмаў». Плюс нейкія «рафікі» ззаду. Плюс выйшла з укрыцьця блакітна-плямавае падразьдзяленьне... Хтосьці з Украіны пытаецца: «У вас што — заўсёды так?!» Як? Мы ня ведаем! Мы тут проста жывем.

Рух за фургонамі. Першымі яго заўважаюць суайчыньнікі асуджаных. Нашыя бабулі крычаць: «Хлопцы, хутка вы будзеце іх вартаваць, а не яны вас!»

Грымнула песьня пра партызанаў (са словамі «Мама, чао»). Па-ўкраінску. Па-беларуску... Гучней... «Адкуль у вас ведаюць словы гімна УНСО?» Каб я мела ўяўленьне, адкуль!..

У першы дзень працэсу аказалася, што абвінавачаньні — тыпова «хуліганскага» зьместу. Тралейбусы спынілі і нашу родную міліцыю «паслалі».

Перад судом «мэтадам укараненьня» невядомы ўкраінскім грамадзянам апэратар здымаў іх у камэры. Калі на гэта была зьвернута ўвага судзьдзяў, галоўны зь іх, Рыгор Казырыцкі, сказаў: «Палітыка ня мае да працэсу ніякага дачыненьня».

Хоць палітыка была як бы ні пры чым, ва ўсіх падсудных пыталіся пра прыналежнасьць да грамадзкіх арганізацыяў іхняе краіны. «Апошняй партыяй, у якой я састаяў, была КПСС», – сказаў Сяргей Патапаў. З годнасьцю адзначыў, што ён расеец і грамадзянін Украіны. І адзіны з усіх дадаў, што падтрымлівае погляды УНА-УНСО. Астатнія, украінцы, ад сяброўства ва УНСО адмовіліся.

Папраўдзе суд павінен быў высьвятліць, хто спыняў транспарт ды лаяў міліцыю. Дакладней, ці рабілі гэта тыя, хто сядзеў за кратамі і на лаве падсудных. Разьбірацца з членствам у арганізацыі, якая была пазбаўлена рэгістрацыі ва ўкраінскім Мінюсьце – справа ня нашых уладаў, у тым ліку судовай.

Але канкрэтныя прыклады таго, каб украінцы абражалі прадстаўнікоў уладаў РБ, устанавіць не ўдалося. Міліцыянты пазнавалі гэта ў лепшым выпадку «по синхронно открывающемуся рту». За некалькі хвілін да таго сказаўшы, што той, хто крычаў абразы, быў ці ў масцы, ці з хусткай на ніжняй частцы твару. Сярод апошніх фігураваў «вось гэты вусаты», як называлі Салаўя, апазнанага «па выразных вачах – пры праглядзе відэакадраў». Сьведка сам манціраваў кадры ў фільм. У фільме, кажа, Салавей ёсьць. «Ледзь пасьпяваюць злавіць «стоп-кадр», бо «чалавек у хустцы» мільгае на 2-3 секунды. Праўда, аказваецца, у чорнай кепцы. А хто спыніў тралейбусы? Стужка пасьля мантажу пра тое замоўчвае. Вось прамова Пазьняка, вось нечая сьпіна, вось «ляпы» мантажора. Вось крыкі і гукі ўдараў без відэашэрагу. Вось твары ўдзельнікаў мітынгу, заліты крывёю бел-чырвона-белы сьцяг... Амаль год гэтую кроў на сьцягу частка народу не заўважала, не адчуваючы травеньскай абразы 95-га!

Былі моманты, калі міжволі ўсьмешкі зьяўляліся нават на тварах хлапцоў з канвою. Адвакаты сваімі пытаньнямі ставілі сьведкаў з «органаў» у тупік, і небаракі (ня ведаю, што магло ім быць ад начальства, калі б суд не праігнараваў адсутнасьць доказаў) блукалі па пакутах нелягічнасьці ўласных сьведчаньняў. Часам усё блыталася ў кучу, як ў той стужцы з парушанай храналёгіяй падзеяў: то выходзіла, што Шаптыцкага затрымалі адразу ў двух месцах, то Салавей, як заўважыў адвакат Уладзімер Калесьнікаў, «адзіны ў трох асобах» атрымаўся. То расеец Патапаў быў апазнаны як «асоба ўкраінскай нацыянальнасьці». Рэальных доказаў сярод усяго гэтага не было.

Яшчэ ў Шаптыцкага спыталі, ці былі зь яго боку абразы ў адрас прэзыдэнта Лукашэнкі. «Ды не чапаў я яго! – адказаў Андрэй. – А вось зь яго боку абразы былі». І згадаў бачаную многімі перадачу Няўзорава «Дні» з выразам пра «дзярмо, якім сьмярдзяць беларускія турмы». Да слова: калі гаварыў Шаптыцкі, усе забываліся, што нехта толькі што не разумеў украінскую мову. Пад яе ўплывам нават судзьдзя часам міжволі ўжываў беларускую. Веданьнем беларускай мовы зьдзівіў пракурор пад час выступу сьведкаў з Народнага Фронту...

У дзень, які нечакана стаў апошнім перад абвяшчэньнем прысуду, абвінавачаныя падалі хадайніцтва аб зьмене складу судовай калегіі, выказаўшы недавер суду. Аднак гэта не было прынята да ўвагі. І зноў зьдзівіў пракурор Целяжэвіч. Яго высновы грунтаваліся на фільме, які ня можа мець юрыдычнай сілы ў якасьці доказу ці сьведчаньня. Мантаж. І здымкі Азаронка ў адным лягічным шэрагу з раздрукаванымі кадрамі «парушальнікаў парадку» (вызначаў іх сам сьведка-апэратар, мантажор, экспэрт...) І адсутнасьць спэцыялістаў у апазнаньні асобы, якіх хацелі прыцягнуць да ўдзелу адвакаты. Карацей, віна была «даказана» праз «відэа».

«Украінскі працэс» (а ня проста справа сямі грамадзянаў ня менш братняй за Расею Украіны) стаў добрым урокам. Урокам адной з славянскіх моваў, якая пры сваёй зразумеласьці перастала пачувацца няроднай для беларусаў. Украінскай годнасьці: вы б змаглі ўзьняць за мяжою свой сьцяг на лаве падсудных? Гаварыць па-свойму? І ГЭТАК трымацца? І ГЭТА сказаць у апошнім слове?

Андрэй Дрыгайла: «Бачна, што міліцыю спэцыяльна пасылалі здымаць злачынствы. Значыць, злачынства – выступаць за незалежнасьць Беларусі?»

Андрэй Бурлака: «Падзеі 26 красавіка, дня нашай агульнай бяды, нагадваюць мне падзеі 18 ліпеня мінулага году ў Кіеве, калі прысутных на пахаваньні сьвятара зьбіваў амон... Між іншым, тады толькі хлопцы з УНСО змаглі абараніць вернікаў»...

Уладзімер Салавей: «Каб вас ня мучыць, так і быць, буду гаварыць маскоўскаю моваю... Так, за мной ёсьць віна. Я вінаваты ў тым, што столькі часу ў войску служыў маскоўскаму імпэрыялізму, а ня вольнай Украіне... Сын даслаў ліст: «Тата, не хвалюйся, за цябе ўся Украіна». І хочацца крыкнуць, каб даляцела да роднага Кіева: «Чую, сынку, чую!..»

Андрэй Шаптыцкі... Ён падзякаваў Богу. Украінцам Беларусі, што даслалі ліст прэзыдэнту. Знаёмым і незнаёмым людзям, што перадавалі перадачы ў СІЗО. Тым беларусам, што рызыкавалі сваім здароўем і свабодай 14-га і 30-га траўня. Сваёй маме, якая «ня плакала і нікому не цалавала ботаў». Дэпутатам украінскага парлямэнту, што падтрымалі яго пад час сухой галадоўкі. («Цяпер я ведаю, колькі сапраўдных украінскіх дэпутатаў: пяцьдзесят чатыры!»)

– Пане суддзі! Ступень вашай строгасьці будзе прама прапарцыйная ступені дыктатуры рэжыму. Гэты працэс ня шыты белымі ніткамі – ён з адных белых нітак і складаецца. Шаноўны дэпутат пан Тыма! Я ня быў членам вашай арганізацыі. Але пасьля таго, як пабачыў тое, што робяць у беларускіх турмах, што б ні стала вынікам судовага працэсу, зь сёньняшняга дня прашу залічыць мяне ў гэтую арганізацыю...

Чаго дабіліся тыя, хто нябачнай рукой кіраваў працэсам? Узгадваюцца словы Веры Бурлака, маці студэнта, які марыў стаць сьвятаром, а стаў вязьнем: «У сына вельмі дрэнны стан здароўя. Я не цікавілася палітыкай і зьдзівілася, пачуўшы, што сын мае дачыненьне да УНА-УНСО. Але калі з Андрэем нешта здарыцца, я перайду на бок УНСО і пайду за ёй. Я не прабачу гэтага Лукашэнку»...

Дык хто прайграў «украінскі працэс» – маральна, псыхалягічна? «Пэўныя колы» трох сталіц? Хутчэй за ўсё. Але, напэўна, паводле адноўленай традыцыі, уласныя хібы зноў прыпішуць каму-небудзь іншаму. ЦРУ. Масонам. Патрыятычным рухам. Журналістам. І кожнаму, хто ня супраць, але ня зь імі. Калі нехта яшчэ сапраўды, няхай моўчкі, ня супраць...

«Украінскі працэс», можа, і скончыўся, але працэс беларускі працягваецца.

Тацяна Сьнітко

Пошта

Не чакайце, пакуль прыйдуць па вас

Найгарачэйшыя месцы ў пекле чакаюць тых, хто ў часы вялікіх крызысаў захаваў нэўтралітэт.

Дантэ Аліг'еры

Фашызм ахінае Беларусь сваім чорным ценем. Ён хаваецца ў знаёмых тварах і абліччах выпадковых суразмоўцаў у цягніку. Ён прамяніцца нянавісьцю з тэлеэкранаў і ўсьміхаецца з газэтных старонак. Як ракавая пухліна, ён прарастае скрозь нашае штодзённае жыцьцё, атручваючы ўсё навокал жывёльным страхам. Крок за крокам фашызм набліжаецца да нашага дому, ён ужо на парозе.

Я амаль чую зьедлівыя галасы скептыкаў: «Дзе ты ўсё гэта ўбачыў, хлопча? Да ты пэўна трызьніш. Мы жывем, як заўжды, мы сумленна працуем, нам няма чаго баяцца. Адкуль такія жахі? Так, жыцьцё цяпер цяжкае, да дэмакратыі нам далёка, але ці можна параўноваць Беларусь зь Нямеччынай часоў Гітлера?»

Пытаньне слушнае, тым больш, што гістарычныя параўнаньні заўсёды «кульгаюць», але і ў Нямеччыне 30-х гадоў усё пачыналася не з канцлягераў. Фашызм непадобны на раптоўны ўдар маланкі. Часам ён прыходзіць пакрысе, патроху. Здаецца, ты толькі адной нагой ступіў у дрыгву, але цяжка заўважыць той момант, пасьля якога ўжо нельга будзе выбрацца на цьвёрдую глебу.

Калі будзе прынятая прэзыдэнцкая «канстытуцыя», якая фактычна пературвае Беларусь у абсалютную манархію, дык гэта ня значыць, што мы ўжо наступнай раніцай прачнемся пад брэх паліцэйскіх аўчарак. Проста тыя працэсы гніеньня, што йдуць цяпер у нашым грамадзтве, атрымаюць найлепшыя ўмовы для разьвіцьця. Беларусь ужо сёньня мае палітычных вязьняў ды эмігрантаў, арыштоўваюцца банкаўскія рахункі газэтаў, прыкрываюцца радыёстанцыі, і няма чаго спадзявацца на розум ды літасьць уладаў. Садыст ніколі ня спыніцца, пакуль не атрымае моцную поўху ў адказ. Крыкі ды стогны ахвяры толькі ўзбуджаюць яго.

Сёньня яшчэ шмат у кім жыве наіўны аптымізм, які зводзіцца да думкі: «Горш ужо ня можа быць». Можа, і ня толькі можа, але і абавязкова будзе горш, незалежна ад таго, як далей будуць разгортвацца падзеі. Сёньня ў Беларусі няма ніводнай палітычнай сілы, якая мела б дастаткова ўплыву, каб самастойна вывесьці дзяржаву з крызысу. Менавіта гэтым карысталася і працягвае карыстацца «партыя ўлады». Добра, што хаця б апошні наступ на рэшткі дэмакратыі ў краіне прымусіў розныя палітычныя групоўкі аб'ядноўвацца для супраціву дыктатуры. Нам можа не падабацца большасьць сёньняшніх «вымушаных апазыцыянэраў», але трэба пазбаўляцца палітычнага ідэалізму і выбіраць з двух ліхаў меншае, каб ня страціць шанец спыніць фашызм.

А тым, хто ўсё яшчэ лічыць, што гэтая палітычная валтузьня яго ня тычыцца, варта прыгадаць словы нямецкага сьвятара Марціна Німюлера, які восем гадоў правёў у фашысцкім канцлягеры: «Найперш яны прыйшлі па камуністаў, і я маўчаў, бо я — не камуніст. Потым яны бралі габраяў, і я маўчаў, бо я не габрай. Потым яны арыштавалі сяброў прафсаюзаў, і я маўчаў, бо ніколі ня быў у прафсаюзе. Потым яны хапалі каталікоў, і я маўчаў, бо я — пратэстант. Потым яны прыйшлі па маю душу, і на той час ужо не засталося нікога, хто мог запярэчыць». Не чакайце, пакуль прыйдуць па вас.

Аляксей Знаткевіч

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Сьветлагорыя – мадэль грамадзтва

Працяг са старонкі 1.

... і спосабы ажыцьцяўленьня

Праект быў настолькі добры, што я пагадзіўся б працаваць у ім і бяз грошай. Але рэальная Сьветлагорыя будавалася як мадэль менавіта НАШАГА грамадзтва, з усімі заганамі менавіта НАШАЙ дзяржавы.

Першая такая загана – няўменьне цьвяроза ацаніць свае сілы. Або звышграндыёзны праект, або выказваньні кшталту: «Я ў «зоне» траву касіў, і нічога. Жыць там можна».

Тое, што жыць там можна, сьцьвярджалі яшчэ экспэрты МАГАТЭ. І з гэтым ніхто не спрачаецца. Але ці можна там ЖЫЦЬ ДОБРА і БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ?

Казаць, што трэба зноў перасяліць людзей у «зону», няхай і зь мінімальным забруджаньнем, – гэта такая ж завышаная ацэнка магчымасьцяў чалавека, як паспрабаваць стварыць уласнае ТБ і радыё ў дзіцячым лягеры, дзе проста няма для гэтага магчымасьцяў. Завышаная ацэнка магчымасьцяў існуе сёньня і на вышэйшым узроўні, і на ніжэйшым.

Мэдычная дыета правалілася з-за супрацоўніцтва з уладамі. Пасьля таго, як прарошчаная пшаніца зь мёдам (каля 100 кг апошняга мы прыцягнулі зь Менску) спадабалася дзецям, і яе сталі даваць рэгулярна, некалькі дзяўчынак атрымалі лёгкае атручаньне. Мясцовы санэпідэмнагляд не знайшоў нічога лепшага, як патлумачыць атручаньне «псыхалягічным фактарам» неўспрыманьня новай ежы. А ніяк не тварожнай запяканкай зь селядцом, якія сталоўка выкінула дзецям у якасьці дзьвюх страваў на адну вячэру... Нетрадыцыйнай ежы ў лягеры больш не было. Як і ўвогуле ніякіх новых і нетрадыцыйных мэтадаў. Засталася хіба што газэта. Але і ёй ужо не было чаго папулярызаваць.

Ці трэба казаць, што «псыхалягічнае неўспрыманьне» нечага новага – гэта стандартны прыклад прыдушэньня ўсіх ініцыятываў у сапраўдным нашым грамадзтве.

Чалавечы фактар

Але што асабіста для мяне было стратаю, дык гэта сама Сьветлагорыя. Файная ідэя, якая дазволіла б «пасябраваць» дзяцей зь Беларусі і Расеі на падставе таго, што яны – сьветлагарыйцы. Калі мы распрацавалі легенду краіны і запусьцілі яе ў дзеяньне, аказалася, што ніхто не грунтуе на ёй сваю дзейнасьць. Ніхто, акрамя нас. Ім прасьцей было працаваць старымі мэтадамі.

Ім – гэта старэйшым пэдагогам. Адна жанчына сказала: «Я былая камуністка, я гэтага не саромеюся, у мяне ў будынку будзе парадак». А я б, напрыклад, саромеўся таго, што я «былы».

Жорсткія «пэдагагічныя» меры выклікалі рэзананс – дзеці пажаліліся ў газэту. За гэта мы атрымалі цэнзуру. Нам сказалі, што можна зараз падняць узровень «балота», але гэта не паспрыяе канчатковай мэце. Трэба балота ўвогуле асушыць. І ў канцы размовы – цэнзура.

Старэйшых пэдагогаў была меншасьць, але яны былі старэйшыя. Цэнзуру да апош-

ніх дзён не адмянілі. Пра Дзіцячы Парлямэнт увогуле забыліся...

Дзеці Свабоды

Дзеці 11-14 гадоў на дыктатарскія мэтады адказвалі радыкальнымі формамі пратэсту. Асобныя атрады аб'яўлялі страйкі і нават галадоўкі супраць тэрору і жорсткасьці сваіх «настаўнікаў». Карэспандэнты газэты стварылі пікет у абарону свабоды слова.

Нашы дзеці, выхаванцы свайго неспакойнага часу, ужо ведаюць, што за свабоду трэба змагацца. Ім засталося толькі адно – прыдбаць мужнасьць. Тыя, хто галадаваў і страйкаваў, набывалі мужнасьць. Бо нашмат прасьцей было затэлефанаваць бацькам і папрасіць, каб яны забралі (такія выпадкі таксама былі).

Але «балота» скалыхнулася. На наступны дзень прэс-цэнтар друкаваў анкеты з пытаньнямі да дзяцей.

Дзеці Чарнобыля

Анкеты прынесьлі з такімі адказамі, што прэс-цэнтар зьніякавеў. Справа не ў газэце – яе падтрымалі 90 працэнтаў дзяцей. Але адказы пра тое, чаго б яны жадалі...

10-12-ці гадовыя дзеці пажадалі адмены пад'ёму і адбою, каб у лягеры гандлявалі (менавіта гандлявалі, а не давалі) марожаным і каб быў «цырк и истрадны канцэрт».

Кіраўнікі растлумачылі гэта проста – дзеці вучацца толькі 2 месяцы ў год. Астатні час яны «аздараўляюцца» па санаторыях ды замежных краінах. Адкуль у іх разьвіцьце?

Некалі меркаваньне пра тое, што 90 працэнтаў дзяцей «зоны» трошкі «тармазнутыя» выклікала ў мяне скептычную ўсьмешку. Бо я і сам з «зоны». Але сёньня мне няцяжка ў гэта паверыць.

Праз 10 гадоў пасьля катастрофы ў дзяржавы няма ніякай палітыкі ў галіне наступстваў Чарнобыля. Гэта і выклікае тое перабольшваньне магчымасьцяў, выказваньні пра зусім бясьпечную тэрыторыю, а з другога боку, дазваляе рабіць зь «дзецьмі Чарнобыля» ўсё, што заўгодна.

Розныя арганізацыі і прыватныя асобы замежжа прапануюць дзецям «аздараўляцца». Але дзеці ў большасьці бачаць за мяжою толькі «цырк і марожанае». Уся цікавасьць да сьвету абмяжоўваецца тэлевізарам і жуйкай.

Тут я прыгадаў словы аднаго з стваральнікаў Канфэдэрацыі Працы Беларусі, які таксама займаецца праблемай лекаваньня дзяцей за мяжой. Пер-



шае яго пытаньне да новага патрнэра: «Ці есьць у вас досьвед у лекаваньні?» Калі ў адказ чуе: «У нас добра распрацаваная праграма...», адразу абрывае партнэра другім пытаньнем: «Колькі шкоды вы маеце намер нам прынесьці?» Бо ён не жадае, каб замежныя дабрадзеі спраўджалі свае мэдычныя тэорыі на нашых дзецях. Але ці чуў ён пра такі вось «пасіўны» спосаб шкоды?

У Беларусі шмат кажуць пра супрацоўніцтва ў гэтай галіне з краінамі Заходняй Эўропы. Там, вядома, шмат грошай. Але практычнага досьведу менш, чым у нас. Вядома, яны жадаюць як лепш. А ў тым, што яны, дбаючы пра здароўе нашых дзяцей, шкодзяць іх разьвіцьцю, вінаватая найперш палітыка нашай дзяржавы ў гэтай галіне.

Праўда, ёсьць сярод замежнікаў і такія, хто жыве за кошт арганізацыі дапамогі нам.

Замежнікі

Іх было шмат. І ўсё было добра, пакуль не прыехалі галоўныя – тыя, хто ўсё фінансуе. Вялікая дэлегацыя замежнікаў, супраць якіх паўсталі ўсе, за выключэньнем тых, хто атрымлівае іхнія грошы.

Мэдыкі завяліся з-за таго, што іхнюю ўнікальную працу замежныя спонсары выдаюць за сваю. Мэдыкі працуюць з васьмі раніцы да дванаццаці ночы, а замежнікі выкарыстоўваюць вынікі іхняе працы як свае.

Дзеці завяліся з-за сьвінскіх адносінаў. Усіх дзяцей прымушалі здымацца – як у канцлягеры, з шыльдачкай на грудзях, на шыльдачцы – імя дзіцёнка і імя спонсара. Акрамя таго, кожны дзіцёнак мусіў пісаць паперу: «Дзякуй багатаму дзядзю за наш адпачынак».

Летась за мяжу паехала выстава дзіцячых малюнкаў. Кіраваў мастацкай майстэрняй Аляксандар Квяткоўскі (бацька журналіста Севярына Квяткоўскага). Сёньня Аляксандар спытаўся, што з выставай. Высьветлілася, што яе прадалі. Ніякіх аўтарскіх правоў, ніякіх ганарараў, нават падзякі дзецям за працу да нас з-за мяжы не дайшло.

Такія замежнікі дакладна ведаюць наша становішча і папросту абкрадаюць нас: матэрыяльна – як з выставай, маральна – як з мэдыкамі, фізычна – як з фатаздымкамі. Бо гэтыя фатаздымкі – карт-бляпш «спонсару» ва ўсіх ягоных дзеяньнях. Дзе потым усплывуць такія падзякі нашых дзяцей, аднаму Богу вядома.

«Колькі шкоды вы маеце намер нам прынесьці?»

* * *

Сьветлагорыя – мадэль грамадзтва. І аднолькавыя праблемы для Беларусі і Сьветлагорыі, створаныя залежнасьцю ад грошай замежнікаў, «псыхалягічным неўспрыманнем», камуністычнымі мэтадамі працы, агульным развалам у абедзьвюх краінах... Няўжо дзеля разьвязаньня гэтых праблем трэба будзе чакаць, пакуль вырасьце новае пакаленьне? Мне так ня хочацца чакаць...

Сяргей Пульша

Залатаная кішэня

У гэтага гораду заўсёды былі сталічныя амбіцыі. Пачынаючы з 1221 году, калі ён быў заснаваны ўладзімера-суздальскім князем Юрыем як супрацьвага Маскве. Амбіцыі, зрэшты, не перашкодзілі Ніжняму стаць выратавальнікам Маскоўскага княства ў 1612-м. Пасьля той вайны ля муроў Макар'еўскага манастыра, што ніжэй па Волзе, актывізаваўся адзін з галоўных расейскіх кірмашоў. У 1817-м кірмаш пераводзіцца ў Ніжні. З таго часу, назапашваючы капітал, гандлюючы з Эўропай ды Азіяй, дыктуючы кошты на шмат якія тавары, ніжагародзкае купецтва робіць свой горад гандлёвай сталіцай Імпэрыі. Таму пытаньня, дзе праводзіць у 1896-м годзе «Всероссийскую промышленно-художественную выставку», своеасаблівую дэманстрацыю дасягненьняў прамысловасьці пачатку расейскага капіталізму, – такога пытаньня не ўзьнікала.

Мяне не зьдзіўляе, чаму ніжагародцы, у большыні сваёй, зусім не настальгуюць па СССР. Забытыя да часу амбіцыі «трэцяй сталіцы» з адыходам за мяжу Кіева й Менску знайшлі сабе нарэшце выйсьце. У адкрыцьці гарадзкой брамы для іншаземных турыстаў і капіталаў, у вяртаньні вуліцам іх сапраўдных назваў (як прыемна гэта рабіць расейцам), у прыбраньні з тых вуліцаў бруду «горкаўскага» пэрыяду, у абраньні сваім кіраўніком маладога-прыгожага, а галоўнае – адкрыта пракапіталістычнага губэрнатара. І вядома, у адраджэньні знакамітага кірмашу.

Неяк пабачыўшы фатаздымкі выставы, якая праходзіла тут сто гадоў таму, я, разам з захапленьнем ад хараства ды маштабу таго комплексу, які сваімі сажалкамі, фантанамі ды палацамі-павільёнамі больш нагадваў імпэратарскую рэзыдэнцыю, адчуў і лёгкую зьбянтэжанасьць – няўжо гэта ўсё было ў маім загажаным раёне? Ад усёй той прыгажосьці не засталося ня тое што сьледу, а й намёку. Таму вестку аб правядзеньні юбілейнай выставы я ўспрыняў зь вялікаю доляй скепсысу. Калі ж пабачыў, як будуюцца звычайныя павільёны на тле

раскошнага Галоўнага Кірмашнага Дому, то зразумеў, што вяртаць былое тут і не зьбіраліся.

Атрымаць акрэдытацыю на кірмашы аказалася справай лягчэйшаю, чым я меркаваў. Магічнае словазлучэньне «Наша Ніва» адчыняла перад мною любыя дзьверы й запальвала ўсьмешкі на тварах перад журналістам з «братской страны». Можа ўпершыню я не задаваў «лішніх пытаньняў». Усю інфармацыю пра выставу й кірмаш за нейкія паўгадзіны з задавальненьнем дала «нашей замечательной газете» прэс-сакратар кірмашу Ірына Марычава. На 25-ці тысячах квадратных мэтраў выставачных плошчаў 64 рэгіёны Расеі й 22 краіны-экспартэры разьмесьцяць тое, «чем богаты». Але галоўнае, як я зразумеў, ня ў гэтым. Нібы застрахаваўшыся ад бесталковасьці задумы, урад перад пачаткам кірмашу правёў адкрыты конкурс інвэстыцыйных праектаў, пераможцы якога атрымалі сродкі з фэдэральнага бюджэту на іх рэалізацыю.

Зьзяючы агнямі, чатырохпалубнік «Феликс Дзержинский», дзе была прызначана прэзэнтацыя Прэс-клюбу, абяцаў вясёлую ночку зь цікавымі знаёмствамі пад ненавязьлівую палітычную балбатню, з магчымым фліртам зь якой-небудзь каляжанкай пад перазвон келіхаў ды танцамі на начной палубе пад цыганскі ансамбаль, як сто гадоў таму. Але на маё расчараваньне нічога такога не было. Прэс-клюб уяўляў сабою ня надта багатую на стравы рэстарацыю з адпаведнаю шоў-праграмай, дзе інтэрмэдыі савецкіх часоў зьмяняліся аглушальнымі акордамі электрычнай гітары. Пад якую ня тое што пагаманіць, а падарыць камплімэнт адной з студэнтак мясцовага журфаку было праблематычна. Зрэшты, яны яго ня вельмі й чакалі ад госьця зь Беларусі. Краіны, на назву якой так жыва рэагуюць у Польшчы й якая ня выклікала ў маіх суседак па століку ніякіх брацкіх эмоцыяў. Я зусім не чакаў ад іх кіданьняў мне на шыю й гарачых пацалункаў, але й падзеі нашай мінулай вясны былі для іх такія ж далёкія, як і сама Беларусь. Таму, адчуўшы сярод гэтай роднамоўнай публікі самую халодную самоту, я не шкадаваў, што прыйшоў сюды. Нібы яшчэ раз атрымаў доказ таго, што нашае брацтва будзе настолькі ж шчырае, наколькі шчырыя будуць лабызаньні, аўгусьцейша дазволеныя нашаму прэзыдэнту.

Дзень адкрыцьця выставы выдаўся сьлякотным паводле ўсіх парамэтраў. Цэльсіяў пад трыццаць, машынаў на пад'ездах да кірмашу пад тысячу, людзей навокал пад мільён. Я адно пасьпяваў дэманстраваць свой бэйдж міліцэйскім пастам, працiскаючыся паміж Волгамі ды Мэрсамі да Галоўнага Кірмашнага Дому. Дзе натоўп бурна вітаў групу, якая ўзыходзіла на памост і зь якой і за мілю бязь цяжкасьцяў можна было вылучыць постаці Чарнамырдзіна й Нямцова. Віктар Сьцяпанавіч з натхненьнем, на якое толькі быў здольны, прачытаў занадта мастацкі для яго тэкст, дзе «Расея ўляцела ў ХХ стагодзьдзе на паравозе, а вылятае...» «На бомбардировщике», – зымправізаваў калега з ИТАР-ТАСС, што стаяў побач. Нямцоў чытаў яўна свой тэкст, у якім Ніжняму адводзілася роля галоўнага гандлёвага цэнтру краіны. Калі губэрнатар дайшоў да пахвальбы тэрмінамі, у якія быў узьведзены выставачны комплекс, зноў абудзіўся ітартасавец. «Борь, ты же рыбок обещал в фонтан запустить. Где рыбки ёптать?» «На обед Черномырдину пошли», – адказаў яму хтосьці.

Напэўна перасядзеўшы ва ўсіх новых мадэлях ГАЗа, перамераўшы піцерскія пінжакі й надзівіўшыся на якуцкае золата, я павінен быў захапіцца ды «іззайздросьціцца». Але, прыняўшы ўсё гэтае багацьце, як адпаведнае вялізнай краіне, я пазайздросьціў расейцам у іншым месцы. Назіраючы на прэзэнтацыі спадарож-

нікавага НТВ за двума Чарнамырдзінамі: лялечным, які казаў сьмешныя глупствы, ды сапраўдным, які заліваўся магутным рогатам. Разам з зайздрасьцю я яшчэ раз адчуў сваю гасьцявую прысутнасьць на чужым сьвяце.

Паблукаўшы яшчэ трохі, я знайшоў і нашых. Краіна, у якой любімая тэма для кіраўнічай балбатні й апраўданьняў – інтэграцыя з Расеяй, была прадстаўленая адным сьціплым стэндам магілёўскага швачнага аб'яднаньня МОГОТЭКС, якое даўно і з посьпехам абшывае Газпрам і расейскае войска. Больш Беларусь нічым у «Будущем России» не адзначылася. У адрозьненьне ад сваіх суседак Латвіі ды Украіны, якія занялі вялізныя экспазыцыйныя плошчы ды паверылі ў сур'ёзнасьць расейскай задумы.

Напрыканцы вечара ўсе чакалі губэрнатарскага прыёму. «Гэта п'янка пад Борыны тосты», – растлумачыў мне ўсё той жа тасаўскі гумарыст. Але ён памыліўся. П'янка была безь Нямцова. Той не вярнуўся з праводзінаў прэм'ера.

Вялізная Гербавая заля, дзе сталы ламіліся «яствами» ад Сьмірноффа, гаманіла пяцістамі галасамі. Усё нагадвала здымкі масавай сцэны для фільма пра канец Імпэрыі – жываты новых буржуа, футры іхніх дамаў, бародкі балбатлівага чынавенства, шустрыя афіцыянты. Не хапала толькі бальшавіка, які б стрэлам у столь прымусіў выслухаць ягоны тост. Але тое кіно, хочацца верыць, скончылася назаўсёды.

Падсілкаваўшыся, я выйшаў на кірмашовы пляц. У зорным небе давалі фэерверк. Рознакаляровыя бутоны агнёў выклікалі гучныя выбухі захапленьня ў паспалітага люду за літаю агароджаю, па гэты бок якой некалькі «дам и господ», уладкаваўшыся ў фатэлях млява пляскалі ў ладкі, як на нудным канцэрце. Я падаўся да народу. Міліцэйскі падпалкоўнік пры парадзе з годнасьцю швэйцара расчыніў мне браму. Ля якой я нарэшце заўважыў тое, што прымусіла мяне пашкадаваць пра адсутнасьць фотаапарату. Паміж французскім і латыскім сьцягамі калыхалася чырвонае палотнішча з вузенькай зялёнай пасачкай наверсе (!). Ля дрэўка акуратнымі ромбікамі былі нашытыя белыя шнурочкі. Я з задавальненьнем дараваў расейцам іхнюю зьбыўлівасьць на сымбалі савецкага пэрыяду. Па выхадзе ж, сярод сьцягоў аздабленьня самых неверагодных колераў ды іх спалучэньняў, заўважыў і вялізны бел-чырвона-белы. Мройная Беларусь была ў шэрагах нясных фантастычных краінаў. Цікава, ці хто-небудзь яшчэ акрамя мяне заўважыў яе тут?..

Зьміцер Бартосік

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Міжнародны камэнтар

На золку новай «вясны народаў»

15 верасьня поўнач Італіі — так званая Рэспубліка Падания — мелася абвесьціць незалежнасьць. Дакладней, не сама дзяржава, межы і сталіца якой яшчэ нікому невядомыя, а тыя людзі, кіраўнікі Лігі Поўначы, што маюць намер адарваць нашчадкаў лянгабардаў ад дзяржавы Гарыбальдзі, чые ваякі,

дамогшыся добраахвотнага ўзьяднаньня Сыцыліі з Італьянскім каралеўствам, з рогатам гулялі ў шары адсечанымі галовамі на ружовых дворыках старасьвецкіх палацаў — страшны эпізод зь Пірандэла і «Хаосу» братоў Тавіяні.

Я даволі скептычна ставіўся да рэальнага падзелу Італіі аж да апошняга лета, калі мне давялося праехаць ад Трыесту да Будапэшту ў адным тамбуры з вэнэцыянскім наркаманам, што кіраваўся ў міжнародны лягер прыхільнікаў хардроку на беразе Дуная. Гэты прасьцецкі муляр са счарнелымі ад опію зубамі аказаўся зацятым прыхільнікам самастойнасьці Поўначы. Ён служыў у адным узводзе з хлопцамі з Поўдня, дык вось, усе яны — махляры, якім адно наўме — красьці. Зь ягонага аповеду я зразумеў, наколькі глыбокую крыўду выносіць з войска кожны паўночны італьянец. А мужчынскія крыўды — найпершы камень у падмурак саматоеснасьці юнай нацыі.

Умбэрта Босі, лідар Лігі Поўначы, ідэоляг аддзяленьня, выказваў намер сабраць на ўрачысты сходмітынг 15 верасьня мільён чалавек, пасьля чаго разам з групай падтрымкі выправіцца ў пешае падарожжа ад мястэчка да мястэчка, накшталт Махатмы Гандзі, дзеля агітацыі за свабоду ад паўднёвых лайдакоў і мафіёзі, і рымскіх бюракратаў. Соль гэтай кампаніі — схіліць жыхароў Поўначы не плаціць падаткаў у дзяржаўны бюджэт (усё роўна тыя гультаі разбазараць). Не выкладайце важкі аргумэнт на карысьць незалежнасьці з вашай кішэні, — вось просты і даступны лёзунг сэпаратыстаў.

Абвінавачаньні наконт крууцельства паўднёвікаў часткова справядлівыя. Так, улетку новы ўрад дзеля экспэрымэнту прызначыў спэцыяльную камісію, каб праверыць, ці ўсе інваліды Нэапаля (а інваліды ў Італіі карыстаюцца вялізнымі льготамі) сапраўды інваліды. З 30 тысячаў зарэгістраваных падддаліся праверцы толькі 12... У Міляне такі размах махлярства наўрад ці магчымы.



І ўсё ж, упэўнены, учора і блізка не сабраўся мільён, каб паслухаць Босі. Бо гэта, як паміж Заходняй і Ўсходняй Беларусяй: і розьніца ёсьць, і крыўды, і суперніцтва, але «ну няўжо ты, дзядзька, сур'ёзна думаеш, што можна аддзяліцца ад Магілёва? Кіньця!»

Ужо тры пракуроры розных гарадоў узбудзілі супраць Умбэрта Босі крымінальныя справы па факце «замаху на канстытуцыйны лад Рэспублікі».

Няґледзячы на ўсю фарсавасьць таго, што адбываецца цяпер у Італіі, і драматызм лёсу курдаў, што ў чарговы раз зазналі пакутаў ад Хусэйна, два гэтыя факты наводзяць на адну думку: на мяжы трэцяга тысячагодзьдзя нас чакае перадзел межаў. І ААН, галоўны гарант непарушнасьці межаў, сёньня сваёй абыякавасьцю да лёсу курдаў, патураньнем Іраку і спробамі вызначыць для ЗША, адкуль і дакуль можна абараняць правы чалавека ставіць крыж ня толькі на старым балянсе, але й на сабе, прынамсі, на старой форме сябе.

Сёньня ў Курдыстане знайшліся свае прыхільнікі «ядзінства», што дзеля захаваньня ўлады здалі незалежнасьць і зьвярнуліся па танкі багдадзкіх калянізатараў, але курды, якія 700 гадоў змагаліся за волю, і якім цяпер волю выпадку палітычнай гульні будзе дапамагаць Амэрыка, усталююць, нарэшце, свой парадак, і гэта будзе першай ластаўкай новай вясны народаў. Чачэнія, Тыбэт, Корсыка,

Інгушэтыя, Біская, Тамілнад, Якутыя, Косава, Казаманка, Джаму і Кашмір, Сыцылія... Дзе спыніцца тэктанічны «разлом палітычнае карты сьвету?

Андрэй Дынько

Чэрчыліянская араторыя ў амэрыканскім стылі

Нашы чытачы, напэўна, ведаюць пра антыцыгарэтную кампанію, якая практычна прагнала звычку з вуліц ды іншых грамадзкіх месцаў. Паленьне цяпер успрымаецца ў многіх заходніх краінах ня проста як шкодная звычка, але лічыцца палітычна некарэктным, а часьцяком і антыграмадзкім дзеяньнем. Курцы пачынаюць разглядацца як непаўнавартасныя людзі ці сваёго роду хуліганы. Напрыклад, падчас нядаўняга інтэрвію галоўнага рэдактара «НН» для нямецкай тэлевізіі, карэспандэнт і апэратар старанна чакалі, пакуль той дапаліць цыгарэту, перш чым уключыць сваю камэру. Яны растлумачылі, што цяпер у нямецкай тэлевізіі нельга паказваць людзей з цыгарэтай. Сваю рэакцыю на такое становішча выказаў у Оксфардзкім Таварыстве Брытанскай Садружнасьці падчас дыскусіі на тэму «Курцы і грамадзтва» з удзелам навукоўцаў, журналістаў, палітыкаў ды ўрадавых чыноўнікаў адзін зь вельмі вядомых амэрыканскіх сатырыкаў-памфлетыстаў з правымі поглядамі П.Дж.О.Рурк.

З упэўненасьцю можна сказаць, што паленьне — гэта права. Можа яно невялікае, бязглуздае, брыдкае, няўручнае і вельмі трывіяльнае права, але гэтае права было даўна прынята, рашуча абараняецца і надзвычай шырока практыкуецца. Тым ня менш, я вылучаю яшчэ адну прапанову: па спрачацца наконт такога сьцьверджаньня — маўляў, паленьне — невялікае, бязглуздае, брыдкае, няўручнае і вельмі трывіяльнае. (Хай не пакрыўдзяцца найлепшыя розумы ўсіх прысутных.)

Я супраць дыскусіі толькі на падставе таго, што гэткага роду публічны абмен думкамі ў такой прыстойнай аўдыторыі — гэта, паводле сваёй прыроды, палітычная падзея. І я ня бачу прычыны таго, што паленьне павінна быць прадметам для палітычнага дыскурсу. Паленьне — гэта чыста грамадзянская ды сацыяльная дзейнасьць — асабістая справа, што мусіць вырашацца сярод курцоў, іх сяброў ды калегаў, якія цярпець ня могуць смуроду, а таксама дактароў, што лекуюць курцоў ды любяць атрымліваць ад іх высокія ганарары за лячэньне ад раку.

Ужо само абмеркаваньне гэтай праблемы сьведчыць пра сымптом агіднай сучаснай тэндэнцыі пераводзіць усё ў сфэру палітыкі. Палітыка павінна абмяжоўвацца выключна рамкамі вядзеньня вайны, абароны ўласнасьці ды, час ад часу, прафіляктычнага адсяканьня галоў членам кіраўнічае клясы.

«Паленьне — права ці прывілей?» Гэтае пытаньне —дыялектычная пастка, у якую любяць завабліваць левыя. «Паленьне — ці гэта не твая справа, га?» Гэтак трохі лепш.

Давайце разгледзім гэтае пытаньне (хай не пакрыўдзяцца нашыя высокашаноўныя апанэнты) зь сьлізкай, мокрай, левай пэрспэктывы: ва ўмовах сучасных начотніцкіх урадаў нічога не зьяўляецца асабістым правам, бо правы маюць на ўвазе й абавязкі, а ў нас больш няма індывідуальных абавязкаў — выключна калектыўныя, палітычныя абавязкі.

Паленьне — гэта не калектыўнае дзеяньне, калі толькі вы не перадаеце запаленую цыгарэту па коле. Але гэта ўжо тэма для іншай дыскусіі. Паленьне таксама ня можа быць і прывілеем, бо ўсе прывілеі былі адменены. Я маю на ўвазе, што хіба мы ўсе не прыхільнікі ўраўнілаўкі? А таму курэньне мусіць быць нечым, што мы атрымліваем ад ураду як частку нашай долі. (Хіба вы ня ведаеце, што крыніцай усіх тавараў ды паслугаў ёсьць урад?) Ну вядома ж вы ведаеце. Вось чаму вы выбераце Тоні Блэра (лідэр Лейбарысцкай (рабочай) партыі ў Вялікабрытаніі — У.Б.). Увогуле, выдаткі на размеркаваньне дабротаў завысокія. Наваt Лейбарысцкая партыя мусіць гэта прызнаць. Некатарыя даброты трэба ўрэзаць... Ну тады давайце ўрэжам паленьне, бо хто будзе г-э-т-а адстойваць?

Але падумайце, якім было б жыцьцё, калі б кожнае рашэньне прымалася большасьцю галасоў! Людзі насілі б выключна спартовае адзеньне. Адзінай ежай, даступнай у Ангельшчыне, была б ... ангельская. І ўсе мы спалі б з Эмай Томсан. І ўсё было б гэта не спадабалася.

Асноўная прычына, каб супрацьстаяць палітычнаму кантролю над паленьнем — гэта ня даць улады, нават самай маленькай ды бязглуздай, у рукі такім людзям, якімі зьяўляюцца прысутныя тут нашыя апанэнты. О так, я ўпэўнены, што яны цудоўныя людзі, і ім можна давяраць у межах іх кампэтэнцыі. Але яны члены небясьпечнай клясы — клясы тых, хто лепей за нас ведае, што для нас добра. Яны альтруісты.

Ці ведаеце вы розьніцу паміж альтруістам і дабрачынным чалавекам? Дабрачынны чалавек прыходзіць да вас у хату ды кажа: «Я чуў, што вы галодны, дык я прынёс вам трохі паесьці». А альтруіст прыходзіць да вас у хату й кажа: «Я чуў, што вы галодны, дык я прынёс вам некалькі кніг на гэтую тэму».

У сыгналах альтруістаў ёсьць элемэнт маральнага застрашэньня: «О, я ведаю, што вы занепакоеныя ўплывам паленьня на здароўе, — кажа альтруіст, — але вы занепакоеныя толькі тым узьдзеяньнем, якое робіцца на некалькі вашых сяброў ды чальцоў сям'і. А я клапачуся пра ў-с-і-х. Я нагэтулькі пра гэта клапачуся, што нават не магу спаць. Я не магу есьці. З-за гэтага нават распаўся мой шлюб. Я ўсё клапачуся, клапачуся ды клапачуся. І, як вы бачыце, паколькі я клапачуся пра гэта лепей за вас, то мусіць я і лепшы за вас чалавек. А паколькі я лепшы за вас чалавек, у мяне ёсьць права — не — абавязак «казаць, што вам трэба рабіць!»

